*Табе, вырашыўшаму паступіць у наш універсітэт, расказваем сёння аб старэйшай ВНУ Савецкай Беларусі.*



Такім будзе галоўны вучэбны корпус


*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№21(412) | Панядзелак, 20 чэрвеня 1960 года | ЦАНА 10 КАП


□ □ □

ПРАЗ ГОД наш універсітэт будзе адзначаць сваё саракагоддзе. Створаны ў 1921 годзе па дэкрэту, падпісанаму У. І. Леніным, ён бурна рос і хутка з'явіўся базай для стварэння шэрагу іншых вучэбных і навукова-даследчых устаноў Беларусі. На базе асобных факультэтаў універсітэта ў 30-ыя гады былі адкрыты палітэхнічны, педагагічны, медыцынскі, юрыдычны інстытуты і інстытут народнай гаспадаркі.

Усяго 39 гадоў існуе наш універсітэт. Параўнаўча невялікі тэрмін. Але гэта былі гады савецкай улады, гады, калі першая ВНУ рэспублікі ўвесь час адчувала на сабе клопаты партыі і ўрада. І вось цяпер універсітэт—буйнейшая навучальная установа і цэнтр развіцця навукі і культуры рэспублікі. За гэты час ён падрыхтаваў звыш пятнаццаці тысяч спецыялістаў у розных галінах прамысловасці, навукі, культуры. Іх можна сустрэць у школах, на заводах і фабрыках, у навуковых установах, на адказных партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных пасадах.

## БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ...

Рашэннямі XXI з'езду КПСС прадугледжана карэнная перабудова ўсёй прамысловасці на новай тэхнічнай аснове. У сувязі з гэтым у бліжэйшыя гады рэспублікі будзе патрэбна вялікая колькасць спецыялістаў радыётэхнікі, радыёэлектронікі, ядзернай фізікі, атамнай і малекулярнай спектраскапіі, вылічальнай матэматыкі і электроннай тэхнікі, хіміі палімераў і хіміі вуглевадародаў, біяхіміі, біяфізікі, фотасінтэзу, генетыкі і селекцыі, мікрабіялогіі і іншых навук.

Таму ў 1960 годзе ў нас значна павялічваецца прыём абітурыентаў на стацыянарнае навучанне на спецыяльнасці фізічнага, матэматычнага, хімічнага і біялагічнага цыклаў.

Уся вучэбная і выхаваўчая работа універсітэта накіравана на тое, каб падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, прывіць ім любоў да працы, пачуццё гордасці за сваю Радзіму і яе вялікі народ. Калектыў універсітэта выхоўвае высокаідэйных адукаваных людзей, якія ўмеюць самастойна ставіць новыя задачы і паспяхова рашаць іх, якія ўмеюць разбірацца ў складаных пытаннях гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, здольных ламаць старыя традыцыі і рухаць навуку і культуру ўперад.

У адпаведнасці з гэтымі патрабаваннямі вучэбныя планы прадугледжваюць разам з лекцыямі вялікую колькасць лабараторных, практычных і семінарскіх заняткаў.

Для асоб, якія пасля заканчэння універсітэта пойдуць працаваць у сярэднюю школу, значна павялічваецца педагагічная практыка.

З мэтай узмацнення практычнай падрыхтоўкі нашых выпускнікоў прадугледжваецца стажыраванне студэнтаў на рабочых месцах па будучай спецыяльнасці.

На ўсіх факультэтах універсітэта ёсць аспірантура, якая рыхтуе кадры для навуковай і педагагічнай дзейнасці. У аспірантуру прымаюцца работнікі прамысловасці, сельскай гаспадаркі, сістэмы ўстаноў культурнага будаўніцтва, якія працавалі па спецыяльнасці не менш двух гадоў, паспяхова праявілі сябе на рабоце і маюць схільнасць да навукова-даследчай работы. У выглядзе выключэння могуць быць пакінуты ў аспірантуры лепшыя выпускнікі з ліку закончыўшых універсітэт па спецыяльнасці: матэматыка, фізіка, механіка, тэарэтычныя раздзелы хіміі і біялогіі.

У цяперашні час на 9 факультэтах Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна навучаецца звыш 6 тысяч студэнтаў. Усю вучэбную і навуковую работу ажыццяўляюць 48 кафедраў, на якіх працуе звыш 300 прафесараў, дацэнтаў, аспірантаў. Універсітэт мае дзве навукова-даследчыя станцыі: Нарачанскую біялагічную станцыю, дзе праводзіцца вучэбная і вытворчая практыка студэнтаў біялагічнага факультэта і вядзецца навуковая работа ў галіне гідрабіялогіі, і вучэбную біёлага-геаграфічную станцыю ў Чырвоным Урочышчы, дзе студэнты праходзяць вучэбную і вытворчую практыку і вядзецца навуковая работа ў галіне генетыкі і селекцыі раслін.

Універсітэт мае тры багатыя экспанатамі музеі: гісторыка-археалагічны, мінералагічны і заалагічны. Пры кафедрах абсталявана 35 кабінетаў і 50 лабараторый. Кніжны фонд бібліятэкі налічвае больш як паўмільёна тамоў.

Цяпер універсітэт рыхтуецца прыняць новае папаўненне. Ва аўдыторыі і лабараторыі ў асноўным прыдуць людзі, якія ўзбагацілі сябе вопытам практычнай работы.

Мы з радасцю прымем вас у дружную студэнцкую сям'ю.

**А. Н. СЕЎЧАНКА,**
**акадэмік АН БССР,**
**рэктар універсітэта.**

## *Рыхтуем рознабаковых спецыялістаў*

Фізічны факультэт—адзін з самых буйных факультэтаў універсітэта. На дзённым і вячэрнім аддзяленнях яго займаюцца каля 600 студэнтаў.

У апошні час значна змяніліся вучэбныя планы факультэта. У іх усё больш месца адводзіцца практычнай падрыхтоўцы нашых навучэнцаў. Ужо з першых дзён заняткаў ва універсітэце студэнты I і II курса будуць працаваць у вучэбных майстэрнях. Яны авалодаюць слясарнай і такарнай справай, пазнаёмяцца з фотасправай, радыёмантажнымі работамі.

Падрыхтоўка спецыялістаў на факультэце вядзецца па двух профілях—педагагічным, з пяцігадовым тэрмінам навучання і навукова-даследчым (пяць с палавінай гадоў навучання). Апошні профіль прадугледжвае падрыхтоўку кадраў для работы ў даследчых інстытутах, завадскіх лабараторыях, канструктарскіх бюро і г. д.

Раздзяленне студэнтаў на гэтыя два патокі праводзіцца пасля трэцяга курса. Практыку студэнты праходзяць у адпаведнасці з абраным профілем. Асобы, якія будуць педагогамі, 12 тыдняў праходзяць педагагічную практыку і 6—вытворчую. Астатнія студэнты праходзяць толькі вытворчую практыку на працягу 38 тыдняў.

Агульнатэарэтычная і спецыяльная падрыхтоўка студэнтаў ажыццяўляецца 6 кафедрамі факультэта: агульнай і эксперыментальнай фізікі, фізічнай оптыкі, спектральнага аналізу, тэарэтычнай фізікі і фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў. Гэтыя кафедры рыхтуюць спецыялістаў у галіне атамнай і малекулярнай спектраскапіі, электра- і фоталюмінесцэнцыі, радыёфізікі і электронікі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў, тэорыі элементарных часціц. Імёны лепшых вучоных факультэта акадэмікаў АН БССР, прафесараў, дактароў навук А. Н. Сеўчанкі, М. А. Ельяшэвіча, М. М. Сіраты, Б. І. Сцяпанава, Ф. І. Фёдарава, І. З. Фішара добра вядомы не толькі ў рэспубліцы, але і ў Саюзе.

Лабараторыі факультэта абсталяваны сучаснымі фізічнымі прыборамі і ўстаноўкамі, некаторыя з якіх з'яўляюцца ўнікальнымі для Беларусі.

Асобы, якія заканчваюць наш факультэт, накіроўваюцца на працу ў сярэднія школы, лабараторыі, канструктарскія бюро заводаў, у навукова-даследчыя ўстановы.

**М. П. ХАЛІМОНОВІЧ,**
**дэкан фізфака.**

## Летапісцы чалавечага грамадства

Гістарычны факультэт рыхтуе настаўнікаў гісторыі і канстытуцыі для сярэдніх школ і гісторыкаў — навуковых работнікаў: археолагаў, этнографаў, музеязнаўцаў, архівазнаўцаў. Закончыўшыя гістарычны факультэт і атрымаўшыя адну з кваліфікацый (археолаг, этнограф і г. д.) адначасова атрымліваюць права выкладання гісторыі і канстытуцыі ў сярэдніх школах.

Залічаныя на гістарычны факультэт абітурыенты, якія маюць двухгадовы вытворчы стаж работы, ці дэмабілізаваныя з радоў Савецкай Арміі і Флота, займаюцца на факультэце з адрывам ад вытворчасці. Асобы, якія паступілі на факультэт пасля заканчэння сярэдняй школы, першы год навучання займаюцца завочна і працуюць на вытворчасці. На 2 курсе і яны пераходзяць на стацыянарнае навучанне.

Для самастойнай работы студэнтаў на факультэце абсталяваны кабінеты гісторыі СССР, гісторыі БССР, усеагульнай гісторыі і гісторыкаархеалагічны музей. У кабінетах праводзяцца кансультацыі, дэманструюцца вучэбныя і навукова-даследчыя кінафільмы, студэнты атрымліваюць вучэбную і навуковую літаратуру, наглядныя дапаможнікі, бібліяграфічныя даведкі.

За пяцігадовы тэрмін навучання нашы студэнты праходзяць рознастайную практыку: педагагічную—у школах, піянерскую—у піянерскіх лагерах, археалагічную і этнаграфічную—у навуковых экспедыцыях, музейную, архіўную, бібліяграфічную—у музеях, архівах, бібліятэках.

Усю вучэбную і навукова-даследчую работу і вытворчую практыку на факультэце арганізоўваюць і праводзяць спецыяльныя кафедры—гісторыі СССР, гісторыі БССР, новай гісторыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, а таксама агульнаўніверсітэцкія кафедры: гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, гісторыі філасофіі і іншыя.

**П. З. САВАЧКІН,**
**дэкан істфака.**

## *ВАС ЧАКАЕ ПРАЦА СЯРОД ПРЫРОДЫ*

Біялогія яшчэ поўная таямніц. Але напэўна недалёкі і трыумф біялогіі, звязаны з раскрыццём таямніц носьбіта жыцця—бялка. Чалавек будучага будзе магутным уладаром прыроды, законадаўцам яе развіцця. І гэтыя сілы дасць яму біялогія.

Але гэта вялікія праблемы і, магчыма, не кожнаму даступныя. У нашага факультэта больш сціплая задача—ён рыхтуе выкладчыкаў біялагічных дысцыплін сярэдняй школы і работнікаў навуковых лабараторый.

Навучанне на факультэце вядзецца з адрывам ад вытворчасці. Студэнты, якія рыхтуюцца да педагагічнай працы, займаюцца 5 гадоў, а асобы, якія рыхтуюцца для работы ў навуковых лабараторыях—5,5 гадоў.

Будучыя біёлагі авалодваюць сваёй прафесіяй на лекцыях, лабараторных і практычных занятках, непасрэдна ў навуковых гуртках і навукова-даследчых станцыях факультэта. Вытворчая і пераддыпломная практыкі студэнтаў праводзяцца ў розных экспедыцыях, на вопытных станцыях, у лабараторыях інстытутаў Акадэміі навук, запаведніках, саўгасах і калгасах.

Добрай арганізацыі вучэбнага працэсу садзейнічае наяўнасць двух вучэбна-навуковых станцый, заалагічнага музея, батанічнага саду, аранжарэі.

На першым і другім курсах студэнты праходзяць агульнабіялагічную падрыхтоўку. З трэцяга курса пачынаецца спецыялізацыя па асобных раздзелах біялогіі. Гэтая спецыялізацыя студэнтаў ажыццяўляецца кафедрамі дарвінізма і генетыкі, фізіялогіі раслін, глебазнаўства, заалогіі хрыбетных жывёл, фізіялогіі чалавека і жывёл, на якіх працуюць такія вядомыя вучоныя, як прафесары Турбін, Сяржанін, Юньеў і іншыя.

Выпускнікі біяфака накіроўваюцца на працу ў навуковыя лабараторыі, вопытныя станцыі і сярэднія школы.

**П. Г. ПЯТРОВІЧ,**
**дэкан біялагічнага факультэта.**



**НА ЗДЫМКУ:** студэнткі біяфака на лабараторных занятках. Фота **А. ШРУБКА.**

## ЧАРАЎНІЦА НАШАГА ЧАСУ

Чараўніцай нашага часу называюць хімію. І гэта так. Без развіцця хіміі немагчымы шырокі тэхнічны прагрэс, немагчыма стварэнне матэрыяльнай базы камунізма. Наш факультэт і рыхтуе спецыялістаў-хімікаў, гэтых магаў і чараўнікоў сучаснай прамысловасці.

Пасля заканчэння агульнай падрыхтоўкі студэнтаў, якая вядзецца на працягу трох курсаў на шырокай фізіка-матэматычнай аснове, студэнты размяркоўваюцца на патокі. У адным з патокаў (тэрмін навучання 5,5 гадоў) студэнты будуць рыхтавацца для работы ў лабараторыях заводаў, навукова-даследчых інстытутаў, канструктарскіх бюро. Больш вузкую спецыялізацыю яны будуць набываць у галіне агульнай і неарганічнай хіміі, арганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, фізічнай і калоіднай хіміі.

Студэнты другога патоку (тэрмін навучання 5 гадоў) будуць рыхтавацца для не менш цікавай і важнай работы ў якасці настаўнікаў. Яны праходзяць месячную педагагічную практыку ў школах і двухмесячную вытворчую — на хімічных заводах. Для студэнтаў жа першага патоку прадугледжан працяглы вытворчы практыкум у 7—9 семестрах.

На хімічным факультэце ёсць 5 кафедраў, якія ажыццяўляюць увесь педагагічны працэс: кафедра агульнай і неарганічнай хіміі, арганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, фізічнай і калоіднай хіміі і кафедра каталізу. На кафедрах працуюць вопытныя і кваліфікаваныя спецыялісты.

**І. Р. ЦІШЧАНКА,**
**дэкан хімічнага факультэта.**



На здымку: студэнткі I курса хімічнага факультэта В. Курбыка і Р. Елісеева на практычных занятках па неарганічнай хіміі.

Фота **А. ШРУБКА.**

